# Палякі і беларусы[1]

**Вітольд Жукоўскі**

## *I*

Колькі ёсць нас, палякаў, ці тых, што прызнаюць сваю прыналежнасць да польскай нацыянальнасці, на Літве і Русі? Ці ўсе гэтыя палякі сапраўды вядуць сваё паходжанне ад польскай нацыянальнасці, ці яны проста спольшчаныя, а паходзяць ад літоўцаў і русінаў? Старажытныя княжацкія і шляхецкія роды Літвы і Русі не залічалі сябе да польскай народнасці, але ад часу далучэння Літвы і Русі да польскай Рэчы Паспалітай яны паволі прынялі польскую мову і польскую культуру. Пасля каланізацыя палякаў у гэтых далучаных краях дасягнула пэўных поспехаў, але не ў такой вялікай ступені, як гэта можа здавацца. Паводле статыстычных дадзеных (да 1897 года),[2] колькасць палякаў, то бок грамадзян, якія размаўляюць па-польску, даходзіць да лічбы 722 тысяч у шасці паўночна-заходніх губернях. Тым самым яны складаюць у гэтых шасці губернях прыблізна 1/10 ад беларускага, 1/3 ад літоўскага і штосьці больш за 1/3 ад габрэйскага насельніцтва. Трэба тут падкрэсліць, што амаль уся так званая дробная шляхта, што жыве на Белай Русі, па-польску не гаворыць, належыць пераважна да каталіцкага веравызнання, абрусела і знаходзіцца на вельмі нізкім адукацыйным узроўні. Таксама слаба і абыякава яна ставіцца да ўсяго, што тычыцца польскай нацыянальнасці. Гэтая дробная шляхта, відаць, і была аднесена да ліку палякаў, што жывуць на Белай Русі. Таксама цяжка зразумець, ці былі ўключаныя ў статыстыку польскага насельніцтва шасці губерняў беларускія сяляне-каталікі. Адным словам, палякі як нацыянальнасць складаюць значную меншасць не толькі ў параўнанні з мясцовым карэнным насельніцтвам, але таксама і ў параўнанні з габрэйскімі жыхарамі краю. Якую ролю яны мусяць граць на Русі? Могуць яны лічыць сябе тубыльцамі літоўскага або беларускага паходжання ці іншапляменнікамі, аселымі ў Літве і Русі? Ад вырашэння і канчатковага вызначэння вышэйзгаданых праблем і пытанняў будзе,



[1] Перакладзена паводле: Żukowski, Witold (1907). *Polacy i Białorusini*. Wilno.
[2] Гл.: Bukowski, Józef (1907). “Ilu nas jest na Litwie”. *Kurjer Litewski,* 15(28).02.1907. – *Спасылка аўтара.*

безумоўна, цалкам залежыць важнасць нашага становішча, палітычная і нацыянальная будучыня польскага элемента ў літоўскіх і рускіх правінцыях. Іншымі словамі: з'яўляемся мы палякамі паводле паходжання і польскімі патрыётамі ці маем мясцовае паходжанне, гэта значыць з'яўляемся літоўцамі ці беларусамі, якія размаўляюць па-польску? Такім чынам, як мне падаецца, я стаўлю пытанне ясна і катэгарычна, без аніякіх агаворак і выкрунтасаў, і адказваць на гэта давядзецца гэтак жа сама – праўдзіва і адназначна: так альбо не.

У Магілёўскай губерні палякі складаюць толькі каля 2% ад усяго насельніцтва (да 20 тысяч) – з той агаворкай, што ў гэтую лічбу было ўключана каталіцкае насельніцтва, якое складаецца з дробнай шляхты, што амаль зусім не размаўляе па-польску. Рэшта, якая польскую мову ўжывае, пераважна належыць да больш заможнай часткі землеўласнікаў і да малой жменькі інтэлігенцыі, якая жыве ў гарадах. Землеўласнікі ўтвараюць практычна адзіную нашу культурную і нацыянальную сілу ў гэтым краі. Таму са знікненнем гэтага класу зямельных абшарнікаў, як іх цяпер клічуць, у нас адразу знікне польскі элемент са сваёй высокай культурай, і край хутка патрапіць у абдымкі чужых элементаў, пераважна пад гегемонію габрэяў.

Такая барацьба ўжо распачалася і габрэі, уступаючы ў шэрагі расійскіх рэвалюцыйных і сацыялістычных партый, робяць выгляд, што прагнуць ісці рука ў руку з народам супраць землеўласнікаў і польскіх грамадзян. Я не з'яўляюся антысемітам і не настроены супраць габрэяў варожа, бо жадаю раўнапраўя і свабоды для ўсіх без выключэння, але такія паводзіны габрэяў у адносінах да польскага насельніцтва ўвогуле мяне пужаюць і напаўняюць глыбокім смуткам і занепакоенасцю. Хто ў гэтай барацьбе выйграе, ці будзе пераможаны?

У Каралеўстве Польскім з пачаткам эры вызвалення і выбараў у Думу[3] габрэі адразу зрабіліся варожа настроенымі ў адносінах да польскай нацыянальнасці ўсяго краю. На Літве і Русі амаль усюды, дзе таго нібы вымагаў іх інтарэс, габрэі выступалі супраць землеўласнікаў і аб'ядноўваліся з антыпольскім лагерам, заўсёды пад маркай прагрэсіўнасці і дэмакратызму!

[3] Маецца на ўвазе перыяд пасля пачатку рэвалюцыі 1905–1907 гадоў, калі расійскі цар Мікалай II вымушаны быў пайсці на змякчэнне палітычнага рэжыму ў краіне і зрабіць пэўныя саступкі дэмакратычным сілам. Сярод іншага, 6 жніўня 1905 года быў выдадзены царскі маніфест аб заснаванні Дзяржаўнай Думы з дарадчымі функцыямі. Маніфестам ад 17 кастрычніка 1905 года вызначалася, што без згоды Думы не мог быць прыняты ніводзін закон у Расійскай імперыі, то бок яна рабілася паўнавартасным заканадаўчым прадстаўнічым органам. Выбары ў Дзяржаўную Думу I склікання адбыліся 26 сакавіка па 20 красавіка 1905 года. – *Заўвага навуковага рэдактара.*

З заняпадам і са знішчэннем польскага элементу ў нашым краі, калі да гэтага дойдзе справа, габрэі, відаць, стануць гаспадарамі сітуацыі і, дзякуючы свайму спрыту, кемлівасці ды грашам, здолеюць, вядома, скарыстацца з перамогі і ўзяць пад сваю апеку неадукаванае мясцовае насельніцтва, узяўшы з гэтай сітуацыі найбольш карысці для сябе. Але ці доўга гэта працягнецца?

У Каралеўстве да гэтага справа не дойдзе, бо польскі народ ім не саступіць, і такі стан рэчаў можа толькі выклікаць страшную грамадзянскую вайну, з якой ужо дакладна габрэі пераможцамі не выйдуць. Што тычыцца Літвы і Русі, то збан толькі да пары ваду носіць, і габрэі ў хуткім часе могуць жорстка паплаціцца, бо тыя ж самыя літоўцы і беларусы, усвядоміўшыся ды адчуўшы ў сабе сілу, не дадуць габрэям вадзіць сябе за нос і хутка выцесняць іх з занятых пазіцый. Таму мы не павінны драмаць, і супольнасць наша мусіць, калі не прагне сваёй згубы, неадкладна ўзброіцца, заняць абарончую пазіцыю, не нападаць, але трымацца абароны. Быць заўсёды гатовым да адбіцця атакі, якая на самай справе ўжо распачалася па ўсім фронце і з розных бакоў.

## *II*

Ва ўступе была пастаўлена надзвычай важная для вырашэння задача: які кожны з нас, народжаных на Русі, мусіць даць адказ на пытанне: “Вы паляк ці беларус?” З’яўляюся і першым, і другім, – адкажуць некаторыя, а можа нават і большасць з нас. Але ж што гэта значыць – належаць адразу да дзвюх нацыянальнасцяў, і ці магчымая такая рэч? Мабыць, магчымая. Возьмем, напрыклад, Швейцарыю, якая складаецца з насельніцтва, што належыць да трох нацыянальнасцяў. Так, гэта праўда – але ці сапраўды існуе швейцарская нацыя?



І Рэч Паспалітая складалася з Польшчы, Літвы і Русі, але кожная паасобку ўтварала адметны край з асобнай нацыянальнасцю, да якой кожны грамадзянін быў змушаны належаць. І паляк, народжаны ў Амерыцы, дзе атабарыўся яшчэ ягоны прадзед, можа адчуваць сябе палякам, размаўляць па-польску, прызнаваць Амерыку за сваю другую айчыну, але паводле паходжання сваім родным краем лічыць перш за ўсё Польшчу. І цікавая рэч: нас з так званага “забранага краю”[4] называюць

[4] “Забраным краем” палякі, а часам і прадстаўнікі іншых народаў былой Рэчы Паспалітай у XIX – пачатку XX стагоддзя называлі землі, якія ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай і не былі ўключаныя ў склад утворанага расійскімі ўладамі ў 1815 года Царства Польскага. – *Заўвага навуковага рэдактара.*

у Каралеўстве і ў замежнай Польшчы літоўцамі, беларусамі, украінцамі. На месцы ж як мясцовае насельніцтва нас лічыць, так і мы ўважаем самі сябе за палякаў, толькі што народжаных на Літве або на Русі!

З гэтага зачараванага кола выбрацца нам вельмі цяжка, а ў выніку мы і самі не ведаем – да якой менавіта мы павінны залічвацца нацыянальнасці?

Выбары як у першую, так і ў другую Дзяржаўную думу з'яўляюцца найлепшым таму доказам. Мы практычна нідзе не вылучаліся як польскія кандыдаты, але як землеўласнікі або грамадзяне, якія належаць да той альбо іншай групы ці палітычнай партыі.

Расійскія ж землеўласнікі, якія засяляюць нашыя заходнія правінцыі, адкрыта прызнаюць сваю прыналежнасць да расійскай нацыі. Яны лічаць праваслаўных русінаў толькі галіной агульнарасійскага племені, і адпаведна ўвесь наш край – неадлучнай часткай расійскай дзяржавы. Адчуваючы такім чынам цвёрды грунт пад сваімі нагамі, яны лягчэй могуць праводзіць свае чыста расійскія памкненні і прапаганду, абмаскальваць пры дапамозе ўрадавых сілаў мясцовае насельніцтва і адцягваць яго ад польскіх уплываў. Урадавы праект аддзялення Холмшчыны ад "Кангрэсаўкі"[5] – справа менавіта гэтых расійскіх гакатыстаў.[6] Апошнія выбары ў Думу на Белай Русі, на Валыні, Украіне і ў Менскай губерні далі адмоўны, антынацыянальны і варожы для польскага элемента вынік, дзякуючы якраз гэтым "ісціннa рускім" дзеячам.



Менавіта ў гэтых умовах палягае ўся розніца паміж расійцамі і намі, і ў гэтых акалічнасцях заключаецца нашая фатальная і ро-

[5] "Кангрэсаўкай" у польскай публіцыстыцы называліся этнаграфічна польскія тэрыторыі, далучаныя да Расійскай імперыі паводле ўмоваў Венскага кангрэса 1815 года. На гэтай тэрыторыі было створана Царства Польскае, якое фактычна праіснавала (хоць часта акрэслівалася іншымі назвамі) да нямецкай акупацыі гэтых земляў у 1915 годзе. У пачатку ХХ стагоддзя ў расійскага ўрада ўзнік праект вылучэння са складу губерняў Царства Польскага тэрыторый з цэнтрам у горадзе Холм, на якіх большасць ці прынамсі значную частку насельніцтва складалі праваслаўныя ўкраінцы. Дадзены праект, які выклікаў крайне негатыўную рэакцыю і пратэсты з боку польскай грамадскасці, быў рэалізаваны ў 1912 годзе, калі з усходніх земляў Люблінскай і Седлецкай губерняў была вылучана асобная Холмская губерня, падпарадкаваная не варшаўскаму генерал-губернатару, а непасрэдна міністру ўнутраных спраў Расійскай імперыі. – *Заўвага навуковага рэдактара.*

[6] Гакатыстамі ў публіцыстыцы канца XIX – пачатку XX стагоддзя называліся члены створанай у Познані ў 1894 годзе нямецкай нацыяналістычнай арганізацыі "Deutscher Ostmarkenverein" ("Нямецкі саюз Усходняй Маркі"), галоўнай мэтай якой было ажыццяўленне канчатковай германізацыі польскіх земляў, што ўвайшлі ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай у зону прускай акупацыі. Простамоўная назва арганізацыі "Гаката" ўтварылася ад першых літараў прозвішчаў яе заснавальнікаў. Польскімі публіцыстамі слова "гакатызм" вельмі хутка стала ўжывацца для абазначэння не толькі германізацыі, але і любой іншай палітыкі, скіраванай на дэнацыяналізацыю палякаў. – *Заўвага навуковага рэдактара.*

спачная сітуацыя ў гэтым краі. Сілы тут няроўныя, і тым больш з развіццём канстытуцыйных свабодаў і нацыянальнага раўнапраўя ў нашым краі барацьба стане ўсё больш вострай, больш зацятай, а для нас непараўнальна больш складанай і цяжкой.

На Літве і Жамойці сітуацыя ўжо трохі іншая. Літоўскае насельніцтва ўжо ўсвядомілася і ўзняло свой нацыянальны сцяг. Літва для літоўцаў – абвяшчаюць літоўскія патрыёты. Мы не патрабуем чужой апекі, гэтаксама як і чужынскага над намі панавання, ні польскага, ні расійскага – мы самі здолеем кіраваць. Гэта вельмі добра, але дайце жыцця і спакою на Літве іншым нацыянальнасцям, а галоўнае – польскай меншасці, якая ні ў чым не вінаватая і літоўцам нічога кепскага не жадае. Бо палякі ж літоўцаў з Польшчы не гоняць. Тыя ж самыя лозунгі абвяшчаюць ужо колькі гадоў галіцкія русіны, якія прагнуць выжыць са сваёй зямлі польскіх грамадзян... за Сан![7] Ці можам мы зараз спакойна, склаўшы рукі і без боязі, чакаць нацыянальнага самаўсведамлення беларускага народа?

## *III*

На выбарах у Дзяржаўную думу, калі мне было пастаўлена пытанне, да якога менавіта лагера я належу, адказваў, што да ніякага, гэта значыць, што беспартыйны, *дзікі,*[8] бо ў дадзены момант не існуе аніводнай мясцовай нацыянальнай і прагрэсіўнай партыі, а як беларус да партый усерасійскіх або чыста польскіх належаць не магу. Безумоўна, з часам мы аб'яднаемся і сфармуем у сябе ў краі нацыянальны лагер, польска-беларускі, абаперты на прагрэсіўныя і дэмакратычныя прынцыпы, і вось тады я без ваганняў уступлю ў такую партыю. Бо палітычная аксіёма заключаецца ў тым, што нонсенсам з'яўляецца любая партыя, якая няздольная кіраваць масамі, і толькі такая партыя сапраўды мае права адыгрываць палітычную ролю, за якой стаяць арганізаваныя масы насельніцтва. У момант, калі на арэну палітычнага жыцця ўзышлі новыя чыннікі, выбаршчыкі з правам



[7] Сан (укр. Сян) – рака, правы прыток Віслы, якая з'яўляецца сімвалічнай мяжой паміж украінскімі і польскімі этнічнымі тэрыторыямі. Гэты сімвалічны статус адлюстраваны нават у словах украінскага нацыянальнага гімна "Ще не вмерла Україна", у другім куплеце якога (праўда, афіцыйна на сённяшні дзень не зацверджаным) ёсць словы "Станем, браття, в бій кривавий від Сяну до Дону". Сённяшняя польска-ўкраінская мяжа часткова (на працягу 55 км.) праходзіць па Сану. – *Заўвага навуковага рэдактара.*

[8] "Дзікім" у польскай палітычнай традыцыі называецца дэпутат парламента, які не належыць да ніводнай фракцыі. – *Заўвага навуковага рэдактара.*

галасаваць, і іх лік ідзе на "тысячы", у такіх умовах прыватныя альбо таварыскія сходы аднаго класа насельніцтва ў абарону пераважна свайго ўласнага каставага і матэрыяльнага інтарэсу губляюць сэнс і значэнне, бо дзейнасць пэўнай партыі альбо нацыянальнага лагера мусіць уключыць масы і ахапіць увесь край.

Такім чынам, хто мае за сабой тысячы, хто безупынна чэрпае сілы і запасы энергіі ў шырокіх народных пластах, толькі той сёння можа прэтэндаваць на тое, каб называцца партыяй.

Ці можа польскае памешчыцтва ў наяўных умовах прэтэндаваць на палітычную дзейнасць і называцца пэўнай нацыянальнай і палітычнай партыяй? Безумоўна, не.

Мы захавалі яшчэ крыху зямлі як адзіную пляцоўку, якую прагнем утрымаць і абараніць ад прымусовай экспрапрыяцыі. І гэта слушна, але ж мы зараз заняты баронім (і тое толькі ўмоўна!) ад згубы зямлю і саміх сябе, а не народ, з якім жывем спрадвеку, з якім звязваюць нас гістарычныя і нацыянальныя адносіны і з якім мы павінны, калі сапраўды жадаем, і надалей заставацца на гэтай зямлі, ісці рука ў руку да агульнай мэты, да супольнай працы і да пераможнай барацьбы "за незалежнасць і свабоду".

Сапраўды, гэта складаная і цяжкая для выканання задача, але яна неабходная і абавязковая, бо іначай мы прайграем бітву і загінем. Таксама немагчыма змагацца, калі мы ўсе будзем правадырамі, але без гармат і без войска. Несумненна, прагрэсіўныя перакананні і памкненні, скіраванне да народа павінны стаць нашым нацыянальным лозунгам. 

Адзіная ж амбіцыя і галоўная задача, якую на Літве і Русі павінны мець палякі, – стаць на чале памкненняў шырокіх пластоў насельніцтва з мэтай вынаходніцтва маральных і матэрыяльных падстаў лепшай долі для ўсяго нашага грамадства.

## *IV*

Летась у Вільні, на сходзе дэлегатаў ад шляхты, буйных землеўласнікаў-палякаў з дзевяці заходніх губерняў, была сфармуляваная і прынятая сходам палітычная праграма палякаў Літвы і Русі. Праграма гэтая, ці, хутчэй, палітычная платформа буйных землеўласнікаў, складаецца толькі з некалькіх пунктаў, вельмі павярхоўная і агульная, аднак прасякнутая прагрэсіўным і канстытуцыйным духам, можа служыць толькі прыладай для абароны інтарэсаў

землеўласнікаў, а таксама польскасці на Літве і Русі. Без апоры, аднак, на дэмакратычныя і грамадскія падставы, агульныя для ўсёй масы насельніцтва, гэты дакумент не можа менавацца нацыянальнай праграмай пэўнай палітычнай партыі.

Для дасягнення гэтай мэты наша будучая нацыянальная прагрэсіўная партыя павінна абапірацца на народныя масы без розніцы стану і веравызнання, абраць дэлегатаў ад паветаў (кожная губерня выбірае пэўную колькасць дэлегатаў) і на агульным сходзе ад дзевяці губерняў перайсці да выпрацоўкі нацыянальнай палітычнай праграмы і стварэння партыі. У яе маглі б увайсці ўсе, незалежна ад нацыянальнасці – палякі, літоўцы, маларосы, беларусы і нават габрэі, – калі будуць згодныя з праграмай гэтай партыі і з прынцыпам салідарнасці.

Я перакананы ў тым, што мы павінны аб’ядноўвацца і фармаваць менавіта нацыянальна-дэмакратычную партыю, абапіраючыся на агульнаграмадскія прынцыпы. Толькі пад штандарам такіх партый мы здолеем выкрышталізавацца, згодна працаваць і выбіраць сапраўдных прадстаўнікоў, якія змогуць бараніць нашыя мясцовыя інтарэсы і інтарэсы ўсяго нашага грамадства. Безумоўна, праграма такой нацыянальнай партыі ў нас на Белай Русі не будзе простай для яе складання і прыняцця, бо з самага пачатку ўзнікнуць розныя супярэчныя адзін аднаму грамадскія погляды, а эканамічнае і зямельнае пытанні будзе неверагодна складана вырашыць так, каб задаволіць пажаданні ўсіх. Толькі пры справядлівым прызнанні правоў кожнага паасобку і пры паразуменні нацыянальных элементаў мы будзем у стане моцна будаваць і карысна працаваць, гэтак сама як і ўвасобіць у нашых формах і ўмовах нашыя вялікія гістарычныя традыцыі.



Тут патрэбныя і неабходныя ўзаемныя саступкі, але толькі з добрымі пажаданнямі, любоўю да краю, выклiканымі патрыятычнымі і чалавечымі пачуццямі, мы здолеем пераадолець сустрэтыя перашкоды і цяжкасці, з’яднацца пад лозунгам роўнасці і братэрства, закласці трывалы падмурак пад наш будучы нацыянальны дом і знайсці ў ім прытулак пад сцягам уласнай беларускай партыі “Свабоды народа” (“Swobody ludu”). І ў недалёкай будучыні, я ў гэтым упэўнены, такая прагрэсіўная і нацыянальная партыя ў нас утворыцца. Русь, Літва і Карона вылучацца з іншых частак дзяржавы і створаць адзіны палітычны лагер, задачай і абавязкам якога будзе:

1) Забеспячэнне палітычных і эканамічных патрэбаў насельніцтва і нацыянальнасцяў, якія насяляюць край;

2) Абарона ад ціску і пераследу, з аднаго боку, “германізму”, а з другога – “маскоўскай перавагі”.

Прадстаўнікі розных прагрэсіўных груп, якія належаць да канстытуцыйна-дэмакратычнай і іншых партый, палякі і не палякі, робяць нашым землеўласнікам цяжкія закіды і надта востра ды з’едліва крытыкуюць іх палітычную тактыку. Адзначу тут галоўныя закіды, якія яны робяць: “На сходах у нашым краі памешчыкаў-палякаў (казаў адзін прамоўца) узнікае непазбыўнае ўражанне, што кіруючай ідэяй усіх праспяваных там песняў пра патрыятызм, нацыянальную культуру, абавязкі і нават пра сутнасць паляка –гэта толькі і выключна прага захаваць цяперашні стан зямельных адносін, разам з імкненнем да жорсткай барацьбы з дэмакратычнай плынню, якая віруе ў сучасным грамадстве... Аднак мы хутка забываемся, што тая нізка вызваленчых і дэмакратычных памкненняў, якая цягнецца праз усю нашу гісторыю пасля падзелаў краіны і відавочна праглядаецца ва ўсіх рухах Еўропы і Амерыкі, дзе паўсюдна прадстаўнікі польскага народа прымалі выбітны ўдзел, не была перарвана ў нашым краі, бо ў нас яшчэ ёсць спраўныя, светлыя і прагрэсіўныя людзі. Але гэтым панам нічога не гавораць палі Амерыкі і Венгрыі, муры Варшавы, Парыжа і Берліна, бадай што, не чулі яны нават прозвішчаў Сцягеннага* і Канарскага*, а пра Касцюшку ведаюць, можа, толькі тое, што гэта быў... вар’ят (!) і да таго ж хадзіў у сялянскай сярмязе... Можа, яны зусім не чулі пра Пясковую скалу[9] і Саюз расійскіх вайскоўцаў Каралеўства Польскага* ў 1863 годзе. На іх не робіць уражання шматколерны сцяг з надпісам “За нашу і Вашу вольнасць” і г. д.

“...Вельмі хацелася б, каб эканамічная падкладка не завяла нашых абшарнікаў вельмі далёка, каб яны не забрудзілі сябе сувяззю з маскоўскімі акцябрыстамі[10] ці іншай падобнай арганізацыяй, каб у вачах Расіі, якая адраджаецца ў пакутах, не апаганілі і не загубілі нашых вызваленчых традыцый, нашай культурнай спадчыны, глыбока адрознай ад той, што абапіраецца адно толькі на валоданні шматлікімі моргамі[11] ці дзесяцінамі зямлі” і да таго падобным.



[9] Маецца на ўвазе бітва каля замка Пясковая скала (Pieskowa Skała) у Малой Польшчы, якая адбылася 4 сакавіка 1863 года паміж польскім паўстанцкім атрадам Марыяна Лангевіча і расійскімі ўрадавымі войскамі. Падчас яе загінуў украінскі рэвалюцыянер Андрэй Пацябня, які змагаўся на баку палякаў. – *Заўвага навуковага рэдактара.*

[10] Акцябрысты – члены права-ліберальнай палітычнай партыі “Саюз 17 кастрычніка”, якая была створана пасля выдання царом Маніфеста 17 кастрычніка 1905 года і праіснавала да распаду Расійскай імперыі. Прытрымліваліся памяркоўна-канстытуцыйнай праграмы. – *Заўвага навуковага рэдактара.*

[11] Морг – адзінка вымярэння плошчы зямлі, раней папулярная ў Польшчы і Беларусі. Роўная прыблізна 0,56 га. – *Заўвага навуковага рэдактара.*

З вышэй прыведзенымі закідамі і крытыкай нашых землеўласнікаў, гэта значыць абшарнікаў, можна пагаджацца альбо не пагаджацца, але прынамсі яны справядлівыя таму, што ім выразна і смела ставіцца ў віну шляхецкая і кансерватыўная афарбоўка, а галоўнае – не нацыянальная.

Адным словам, калі нашыя землеўласнікі адасобяцца ад рэшты грамадства, то яны будуць асуджаныя на поўную няўдачу. Хоць землеўласнікі складаюць у нашым рэгіёне значную частку польскага элемента, яны не могуць заставацца кастай, а павінны таксама ахапіць, ці прыцягнуць да сябе, усе слаі насельніцтва, таму не могуць мець сваёй мэтай абарону інтарэсаў прывілеяванага слоя насуперак інтарэсам і памкненням масаў насельніцтва. Таму наша сацыяльная праграма будзе плёнам нашых думак і пачуццяў і будзе вырашаць праблемы ў адпаведнасці з сапраўднымі мясцовымі патрэбамі, але пры гэтым не будзе бескрытычна пераносіць на нашу глебу рэцэпты і формы, якія ўзніклі ў зусім іншых умовах на Захадзе і Усходзе.

У такой праграме павінны быць належным чынам разгледжаныя ўсе правамерныя і пажаданыя інтарэсы. Нацыянальная праграма ў нашым краі, якая возьме пад увагу думкі і памкненні ўсіх сацыяльных слаёў, у сваю чаргу дасць падставу для згоднага суіснавання з іншымі нацыянальнасцямі, нават і не далучанымі да нашай партыі. Польскі элемент не можа выказваць прэтэнзіі выключнасці на Літве і Русі, ён павінен толькі імкнуцца да стварэння ў краі такіх умоў, каб усе яго жыхары на самай справе аб'ядноўваліся як "вольныя з вольнымі і роўныя з роўнымі". Адасабленне землеўласнікаў, згубнае для іх саміх, было б таксама шкодным і для нашых нацыянальных інтарэсаў.



На Літве і Русі задача польскага элементу, безумоўна, вельмі цяжкая, і толькі сумесная праца і супольныя высілкі ўсіх пластоў нашага грамадства могуць забяспечыць нам нармальныя ўмовы развіцця.

## *V*

Зямельнае, ці аграрнае пытанне, паднятае на ўсходзе дзяржавы расійскімі апазіцыйнымі партыямі ў якасці рэвалюцыйнай і вызваленчай зброі, скіраванай супраць бюракратычных уладаў, звалілася на наш край досыць варожым і трывожным чынам. Ці будзе яно здавальняюча вырашана сіламі самога ўраду або дзвюма палатамі парламенту без праліцця крыві – казаць пра гэта і рабіць прагнозы мы не

можам. Гэтае пытанне, балючае і надзвычай цяжкое для развязання ў маштабах расійскай дзяржавы ўвогуле, было прымусова навязанае і нам, у гэтым бедным і няшчасным краі. Гэта вельмі спрычынілася да раздражнення масаў і да падзелу нашага грамадства на варожыя і непрымірымыя групоўкі.

Безумоўна, нашыя землеўласнікі, маючы ўласныя інтарэсы і змагаючыся за сваё існаванне, не могуць пагадзіцца на поўную канфіскацыю сваёй зямлі, падпісацца пад сваім знішчэннем ці пайсці на добраахвотнае самагубства. Гэта натуральная рэч, якая не патрабуе тлумачэння. Пры гэтым польскі элемент у нас, як найбольш культурны, і захаваўся амаль што толькі дзякуючы гэтай зямлі, а пазбаўлены яе на карысць усяго грамадства, у большасці складзенага з няпольскага элементу, адразу б у нашым краі знік.

Таму ці можам мы пагадзіцца на развязанне праблемы такім чынам, як гэтага намагаецца нават партыя канстытуцыйных дэмакратаў*?

Безумоўна, не. Таму мы ўсе спалохаліся прывіду "прымусовага адчужэння зямлі" як найстрашнейшага для нас няшчасця і канчатковага разгрому, большага за ўсе ўціскі, перасведы ўладаў, адчужэнні і канфіскацыі часоў мураўёўскай тыраніі.

Пагаджуся з крытыкай кадэтаў і іншых прагрэсіўных фракцый, што "кіруючай ідэяй усіх выказаных (на сходах землеўласнікаў) патрабаванняў... было толькі і выключна жаданне захавання цяперашняга становішча ў зямельных адносінах...". Дадам ад сябе, што прагрэсіўная група землеўласнікаў таксама прагне пэўных зменаў, паляпшэнняў і рэформаў менавіта ў зямельных адносінах, але пры гэтым нашыя прагрэсіўныя і нацыянальныя партыі павінны пагадзіцца і зразумець што: 1) у сучасных умовах, у якіх знаходзіцца ўвесь край, усялякія эканамічныя, сацыяльныя і аграрныя рэформы не могуць быць вырашаныя і належным чынам праведзеныя; 2) перш за ўсё трэба правесці ў дзяржаве палітычна-нацыянальныя змены і рэформы. Калі дзяржава будзе нарэшце мець сваю канстытуцыйную сістэму і свой нацыянальны ўрад, адказны перад парламентам, калі фінансы будуць урэгуляваныя і кантралявацца парламентам, калі, нарэшце, аўтаномія і самакіраванне сапраўды будуць уведзеныя ў жыццё, нацыянальныя памкненні ва ўсёй дзяржаве будуць задаволеныя і нармальнае ды спакойнае жыццё запануе ва ўсіх кутках гэтай дзяржавы – толькі тады парламент, сеймы або органы самакіравання ўсіх краёў змогуць спакойна і па-сапраўднаму прыступіць да вырашэння гэтых вялікіх сацыяльных і эканамічных праблем і пытанняў.

Таму мы павінны распачаць нашае будаўніцтва спачатку, гэта значыць з падмурку. Калі б на такую платформу пагадзіліся людзі прагрэсіўных поглядаў з усіх слаёў грамадства, то мы змаглі б прыйсці да згоды і сфармаваць "нацыянальныя і прагрэсіўныя партыі", пра якія я згадваў вышэй. Калі ж мы гэтую справу не зробім, то загінем самі і кінем наш край на спажыву падступным, чужым і варожым да ўсіх нас сілам.

Вялікая рэформа па вызваленні сялян з-пад прыгону ў нашым краі ў 1861 годзе і адчужэнне зямлі ад землеўласнікаў прайшлі мірна і без праліцця крыві. Вялікая ж сацыяльная і эканамічная рэформа, якую мы жадаем правесці і ажыццявіць цяпер, павінна таксама быць вырашана і здзейснена спакойна – не рэвалюцыйным, а эвалюцыйным чынам. Дэмакратычныя і сацыялістычныя (не анархічныя) партыі ў Германіі, Францыі і іншых краінах імкнуцца таксама правесці свае сацыяльныя і эканамічныя рэформы не рэвалюцыйным, а эвалюцыйным шляхам. Але гэтыя краіны ўжо маюць уласны канстытуцыйны лад і свае нацыянальныя свабоды. Мы ж іх не маем, і таму менавіта да гэтай мэты ўсімі магчымымі спосабамі павінны імкнуцца.

Усерасійская канстытуцыйна-дэмакратычная партыя, у якую спачатку ўвайшло шмат палякаў і землеўласнікаў нашага краю, падчас дзейнасці ў першай Дзяржаўнай думе адразу змяніла сваю палітычную тактыку. Пасля яна пайшла ўлева, у абдымкі крайніх партый, і перарабіла ўласную аграрную праграму, паставіўшы агулам для ўсёй дзяржавы, без выключэнняў, задачу суцэльнай нацыяналізацыі зямлі і яе сацыялізацыю з вызначэннем працоўнай і маёмаснай нормаў. З такой палітыкай і тактыкай канстытуцыйна-дэмакратычнай партыі нашыя нацыянальныя, дэмакратычныя і супярэчныя ідэям розных пераваротаў сілы абсалютна не маглі пагадзіцца, і таму практычна ўсе палякі выйшлі з партыі кадэтаў. Некаторыя, аднак, засталіся там на шкоду для нашай грамадскасці і без карысці для партыі кадэтаў. Мабыць, здольныя і адукаваныя адзінкі, прасякнутыя нацыянальным і патрыятычным духам, могуць адыграць пэўную станоўчую ролю і спрычыніцца да абароны нашых інтарэсаў, застаючыся надалей членамі гэтай партыі. Аднак гэта толькі кроплі ў моры, і з часам яны згінуць ва ўсерасійскім партыйным акіяне, пры гэтым, безумоўна, не атрымаюць поля для выступленняў ды дзейнасці, а грамадскасцю будуць лічыцца малазначнымі, адасобленымі і няпольскімі суб'ектамі.

Здольны адвакат і прамоўца, былы дэпутат Лядніцкі*, які прынале-

жыць да партыі кадэтаў, не можа развіць належнай дзейнасці і стаць на чале нацыянальнай і прагрэсіўнай партыі ў нашым краі, бо звязаны праграмай і палітыкай партыі кадэтаў і толькі ў яе рамках можа мець хоць нейкае значэнне.

Былы член Дзяржаўнага савета ад Магілёўскай губерні Г. Выкоўскі*, здольны і адукаваны чалавек, грамадзянін са спартанскімі прынцыпамі і дэмакратычнымі перакананнямі, звязаны дысцыплінай партыі кадэтаў, да якой належыць, падаў у адстаўку пасля роспуску першай Думы, зрабіўшы тым самым вялікую шкоду і крыўду для ўсяго нашага грамадства.

Безумоўна, ёсць фанатыкі і дактрынёры ў кожнай палітычнай партыі, гэтаксама як у любой рэлігійнай або сацыяльна-грамадскай ідэалогіі. З імі цяжка прыйсці да якога-небудзь паразумення. Але мы знаходзімся ў зусім выключным становішчы, не падобным на сітуацыю народаў іншых краін і грамадстваў, бо гаворка ідзе пра наша жыццё, пра нашу нацыянальную будучыню. Таму мы абавязкова павінны прыйсці да паразумення і да сумеснай дзейнасці.

## *VI*

Мы жывем ў краі, дзе жыве карэннае беларускае насельніцтва; аднак нашыя землеўласнікі, якія здаўна пасяліліся ў гэтым самым краі, хоць у большасці ўжываюць у размове польскую мову і належаць да каталіцкага веравызнання, адчуваюць сябе грамадзянамі гэтага самага краю і абаронцамі беларускага народа. Яны павінны таксама ісці рука ў руку з гэтым народам, сумесна з ім бараніць інтарэсы краю і разам з ім працаваць. Прасвятляць народ, прышчапляць у яго галовах і сэрцах сваяцкія, нацыянальныя, патрыятычныя думкі і пачуцці – менавіта ў гэтым палягае галоўная задача і мэта дзейнасці нашай інтэлігенцыі. На барацьбу з цемнатой, з разбуральнымі сіламі, з анархіяй, а галоўнае – з абмаскальваннем нашага народа павінны стаць усе без выключэння. Добра ж забяспечаныя нашыя землеўласнікі маюць абавязкі перад айчынай большыя, чым прадстаўнікі іншых слаёў. У якім становішчы знаходзяцца зараз часткі колішняй Рэчы Паспалітай? У Познаньскім краі польскасць змагаецца не на жыццё, а на смерць з найстрашнейшым ворагам славяншчыны – з немцамі. У Галіцыі барацьба польскага і русінскага элементаў набірае хваравітыя і трывожныя маштабы.

На землях, занятых Расіяй, для нас існуе пагроза з усіх бакоў, як унутры краю, так і звонку. Акрамя рэвалюцыйнага і сацыялістычнага лагера, мы маем у краі таксама сілы або адкрыта варожыя польскасці, або тыя, што пад яе маркай з ёю ж змагаюцца.

Такім чынам, мы павінны ўважліва сачыць не толькі за нашай знешняй палітыкай і пазіцыяй адносна іншых палітычных і нацыянальных сілаў, але і за ўнутранай палітыкай.

Несумненна, цяжка хоць бы і чыста напаказ адмовіцца ад часткі сваіх ідэалаў, але таксама мы, безумоўна, не можам згадзіцца з праграмай і кірункам, абвешчанымі Усяпольскай партыяй,[12] бо гэта будзе згубай для нас тут, на беларускіх ускраінах. Нам таксама патрэбна незвычайная палітычная тактоўнасць для распаўсюду нашых ідэалаў, без шкоды для атачэння, але з агульнай карысцю. Становішча наша больш чым цяжкое, нават надзвычай крытычнае. Мы стаім перад загадкай, якую ў стане разгадаць толькі будучыня: узмоцніць ці аслабіць польскі элемент на Літве і Русі падтрымка і прыняцце ўдзелу ў руху абуджэння нацыянальнага самаўсведамлення беларусаў і ўжо здзейсненага развіцця літоўцаў? Бо як іначай, калі не салідарызаванне з мясцовым насельніцтвам, раўназначнае адмаўленню ад усялякай культурнай і эканамічнай працы? Неаспрэчнай праўдай ёсць таксама тое, што палітычныя праграмы для дадзеных рэгіёнаў могуць складаць толькі людзі, цалкам абазнаныя ў мясцовых умовах і якія, маючы на ўвазе свае нацыянальныя ідэалы, змогуць іх сумяшчаць з чужымі нацыянальнымі ідэаламі і абменьвацца ўзаемнымі паслугамі.



Гэтая задача цяжкая, але не немагчымая, таму што не мы адныя знаходзімся ў правінцыі з разнароднай нацыянальнай структурай. Мы павінны прыцягваць да свайго нацыянальнага лагеру ўсіх, натуральна, улічваючы правы меншасцяў, але без прапаганды і прыхаваных намераў іх навяртання, паланізацыі, русіфікацыі альбо навязвання каму-небудзь сваіх рэлігійных ці атэістычных перакананняў. Крый нас, Божа, ад гэтага. Наш вызваленчы лозунг павінен заключацца “ў абсалютнай рэлігійнай талерантнасці і нацыянальнай свабодзе”.

Толькі на такіх умовах мы здолеем аб’яднацца і працаваць для агульнай карысці.

[12] Усяпольская партыя (Stronnictwo Wszechpolskie) – адна з назваў нацыянальна-дэмакратычнага (эндэцкага) кірунку ў польскім нацыянальным руху. Прыхільнікі гэтага кірунку стаялі на пазіцыях польскага нацыяналізму і выступалі за адбудову Польшчы як чыста нацыянальнай дзяржавы. Найбольш вядомым іх ідэолагам у межах Расійскай імперыі быў Раман Дмоўскі. – *Заўвага навуковага рэдактара.*

Хай русін адчувае сябе ў Літве і ў Польшчы як у сябе дома, і наадварот, паляк альбо літовец няхай таксама адчувае сябе на Русі як і ў сябе дома.

## VII

“Асвета народу”, як найгалоўнейшы чыннік развіцця і нашай дзейнасці, павінна, навучаючы дзяцей чытаць і пісаць на роднай мове, прышчапляць пры гэтым у іх розумы ды сэрцы рэгіянальныя і нацыянальныя пачуцці. Асвета – гэта матка, якая прыхіляе да свайго лона, корміць, туліць і песціць у сваіх абдымках дзяцей без розніцы стану і веравызнання, да якога яны належаць. Асвета – гэта сонечны прамень, які грэе і асвятляе ўсіх нас, хрысціян ці не хрысціян, заможных або бедных і маленькіх.

Не стварайма ж рэлігійных таварыстваў, гэтаксама як атэістычных, якія толькі паводле перакананняў могуць нас падзяліць. Навошта нам пастаянна дзяліцца і адасабляцца? Наша грамадства яшчэ не дайшло да тых навуковых і філасофскіх вышыняў, гэтаксама як і да той цывілізаванай і свабоднай культуры, каб магло абысціся без рэлігійных вучэнняў і практык, і таму, адукоўваючы народ, мы не павінны імкнуцца да пазбаўлення дзяцей ад перакананняў і канонаў той рэлігійнай канфесіі, да якой належаць іх бацькі. Аднак мы не можам таксама пагадзіцца з тым каставым, адасабляльным, неталерантным, а перш за ўсё непалітычным прынцыпам, якога так прагнуць некаторыя – закладанне асобных рэлігійных школ, у якіх маглі б вучыцца толькі дзеці, якія належаць да аднаго пэўнага веравызнання... Святыня, якую мы жадаем збудаваць у нашым краі пад пратэкцыяй і кіраўніцтвам польскай грамадскасці, павінна служыць для асветы і навукі ўсіх грамадзян і слаёў грамадства, гэта значыць не толькі для адных палякаў і каталікоў, але для ўсіх без выключэння, хто прагне гэтай асветы. І да гэтай святыні, узведзенай намі, прыйдуць з пахіленай галавою ды трымаючыся за рукі ўсе грамадзяне нашага краю, як роўныя з роўнымі, а на яе сцяне зверху будзе бачны надпіс “польская асвета народу”.

Такім чынам, калі ўмовы ў нас зменяцца да лепшага, калі мы атрымаем магчымасць вучыцца і вучыць паводле нашых пажаданняў і нашай праграмы, мы, безумоўна, прыйдзем да станоўчых і вельмі карысных вынікаў. Не сёння, дык заўтра наш беларускі народ падымецца са

свайго нізкага ўзроўню культуры, на якім цяпер знаходзіцца, а таксама неўзабаве зразумее, чым ён ёсць і чым павінен быць. Нашае ж усвядомленае і адукаванае грамадства падасць яму братэрскую руку і дапаможа ўзняцца ды стаць на праўдзівы і цывілізаваны нацыянальны шлях. У гэтым палягае ўся нашая задача і пакліканне ў краі, а таксама наш святы абавязак.

Польска-беларуская партыя, якая будзе грунтавацца на нацыянальных і прагрэсіўных прынцыпах, павінна абавязкова ўзнікнуць у нашым краі, і паўстане ўжо неўзабаве, я ў тым ўпэўнены. У адваротным выпадку нашая місія ў гэтым краі мусіць скончыцца, і ў будучыні польскі элемент не будзе мець магчымасці адыгрываць аніякай выбітнай ролі на Літве і Русі.

Мы маем патрэбу не ў сентыментальнай ўзнёсласці, не ў раздражняльным шэпце, а ў жалезнай волі і магутнай сіле розуму. Мы маем неабходнасць не ў пасіўным ідэалізме, не ў самадурчых і аджытых патрабаваннях і капрызах, а ў мазольнай працы ў сваім доме, нязломным гарце і сталасці перакананняў. Тут, на Русі, мы ўтвараем жывую часціну гістарычнай супольнасці са з'яднанымі нацыянальнымі рысамі і маем абавязкі перш за ўсё ў дачыненні да яе. Мы не можам замыкацца ў выключнасці і каставасці. Толькі краёвая ідэя, якая запальвае сэрцы на шчаслівую будучыню, можа паспяхова аб'яднаць нашыя высілкі і прыцягнуць да нас наш цёмны і ашуканы народ. Толькі на гэтай падставе можа наноў змацавацца залатымі повязямі даверу і веры ў лепшае жыццё нашая старадаўняя гістарычная цэласнасць.



Мы, палякі ці грамадзяне польскага паходжання, як каму больш падабаецца нас называць, жывем на літоўскіх і рускіх землях некалькі стагоддзяў, заўсёды баранілі гэтую зямлю сваёй крывёй і захіналі яе сваімі грудзямі ад знешніх ворагаў, працавалі на гэтай зямлі, зрасліся з ёю, таксама як і з народам, які на ёй жыве. Мы не толькі землеўласнікі, земляробы, але і грамадзяне гэтага краю, таму для нас з'яўляюцца дарагімі і святымі ўсе грамадскія пласты беларускай нацыі.

* * *

Гудзіць у поўнач, сосны ломіць,
І плачэць вецер у боры
І белы снег да неба гоніць
Чаму так вецер плачэш ты?

Ах плачу я што ноц бяз сонца
Нігдзе дарогі не знайду,
І так кідаюся бяз конца
Не знаю сам куды лячу.

Ў грудзях паліць і серцэ млее
І так маркатна на душы,
Каліж дзянёк нам заясьнее
Чаму так серцэ млееш ты?[13]



[13] Гэты верш прыводзіцца напрыканцы брашуры Вітольда Жукоўскага па-беларуску лацінскім шрыфтам. Ягоны аўтар не пазначаны, магчыма, ім ёсць сам Жукоўскі. Тут тэкст верша падаецца ў кірылічнай версіі з захаваннем усіх асаблівасцяў арыгіналу. – *Заўвага навуковага рэдактара*.